View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 392.51**

# РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВЫЯ ФУНКЦЫІ МАСКІРАВАНЫХ ПЕРСАНАЖАЎ У ТРАДЫЦЫЙНЫМ ВЯСЕЛЬНЫМ АБРАДЗЕ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XXI стст.)[1]

***В.І. МІШЫНА, П.І. МІШЫН***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*На падставе апублікаваных этнаграфічных апісанняў і палявых матэрыялаў у артыкуле разгледжаны рытуальна-абрадавыя функцыі такіх маскіраваных персанажаў, як "цыганы", "падстаўныя маладыя" і інш. у кантэксце традыцыйнага вяселля беларусаў Падзвіння. У ліку асноўных функцый названых персанажаў вылучаны апатрапейная, функцыя благаславення і надзялення доляй, рэтранслятыўная, забаўляльна-гульнёвая (найбольш характэрная для сучаснай абраднасці). Ахарактарызаваны асноўныя спосабы і сродкі маскіравання, адлюстраваны працэс яго трансфармацыі пад уплывам соцыякультурных змен на працягу разглядаемага перыяду.*

***Уводзіны.*** Маскіраванне з'яўляецца неад'емным элементам традыцыйных рытуальна-абрадавых комплексаў каляндарнага і сямейнага цыклу. Пры гэтым з'яву маскіравання варта разглядаць не толькі як закрыванне твару маскай, але больш шырока – як "пераўвасабленне ўдзельніка рытуалу пры дапамозе маскі або грыма, касцюма, бутафорыі, якое ў час выканання абрадава-магічных дзеянняў дапаўнялася жэстамі, своеасаблівай манерай паводзін, музыкай, танцамі, словамі. Вялікае значэнне мелі таксама матэрыял, з якога выраблялiся маска і карнавальны касцюм, іх колер, форма і рэчывы, што выкарыстоўваліся для грыміроўкі твару" [1, с. 7].

Да ліку сродкаў і спосабаў, з дапамогай якіх ажыццяўлялася маскіраванне ў традыцыйнай культуры, можна аднесці:

– пераапрананне (часта – у зношанае, падранае, вывернутае адзенне; у адзенне процілеглага полу, "чужой" сацыяльнай (этнічнай) групы);

– маскіроўка твару (з дапамогай уласна маскі, грыму, галаўных убораў);

– гіпербалізацыя фізічных параметраў (у тым ліку полавых прыкмет);

– антыпаводзіны (падкрэсленае парушэнне сацыяльных нормаў, ужыванне ненарматыўнай лексікі, "непрыстойны" характар дзеянняў, жартаў, спеваў або, наадварот, пасіўнасць, маўчанне і г.д.)

***Асноўная частка.*** Для падзвінскай (і беларускай у цэлым) вясельнай традыцыі ўласціва прысутнасць маскіраваных персанажаў на розных этапах вяселля. У той ці іншай ступені ў якасці такіх персанажаў могуць выступаць і самі галоўныя ўдзельнікі вяселля (напрыклад, калі жаніх у доме маладой сядзіць у шапцы, а маладую вязуць да жаніха з пакрытымі галавой і тварам); і бацькі маладых (апрананне вывернутага кажуха ў моманты абрадавых выпраўленняў ці сустрэч); і розныя вясельныя чыны – сват, кубельнік, каравайніцы, сяброўкі нявесты і г.д. У лакальнай традыцыі слупавога рытуалу прысутнічае т.зв. "сталбавый": "у абарваных лапцях, у зношаным баолахоне-насове, у рванай шапцы і з растрапанымі валасамі" (Гарадоцкі уезд) [2, с. 403]. Названы персанаж выконвае медыятыўна-пасрэдніцкую функцыю, па сутнасці, з'яўляецца рытуальным спецыялістам, што забяспечвае кантакт з іншасветам, наладжвае дыялог з боствамі і запрашае іх на вяселле [3]. Шырокае распаўсюджанне меў звычай выстаўляць перад маладым "падстаўную нявесту", у ролі якой магла быць маладая дзяўчына, старая бабуля або нават мужчына: "…схаваюць маладуху, а каго-небудзь пасодзюць…Плаціць нада, што маладуху ўжо ўкралі… А яе пасодзюць, ай, ну фату так ускінуць, што вот заместа…"[2]; "… і цвяты прыладзюць, нібыта маладуха, за стол пасадзюць, а маладую схаваюць куды-небудзь"[3]. Дадзены элемент можна разглядаць як частку сімвалічнага зместу абрада ў кантэксце рэалізацыі абрадавага проціпастаўлення "свой-чужы" ў працэсе ўзаемадзеяння абрадавых груп жаніха і нявесты.

Аднак прадметам нашай увагі ў дадзенай працы будуць маскіраваныя персанажы, з'яўленне якіх устойліва звязана з другой паловай вяселля (канец вясельнага застолля ў маладой, раніца другога вясельнага дня ў маладога, завяршэнне вяселля). Гэта найперш "падстаўныя" ("фальшывыя") маладыя" і "цыганы".

*"Падстаўныя маладыя"*, як правіла, фігуруюць у вясельным абрадзе у той час, калі сапраўдныя маладыя яшчэ не паспелі заняць свае месцы за вясельным сталом (або ўжо іх пакінулі). Шырокае распаў-

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РДНФ (ПР) "Традиционный этнокультурный и языковой ландшафт Витебско-Псковского пограничья в конце XIX – начале XXI в.: уровни репрезентации и динамика кросскультурных связей", дамова № Г16РП-004.

[2] Зап. студэнтка ПДУ Суханава Я. ў 2009 г. ад Кастрыцкай М.Ц., 1932 г.н. у в. Забор'е Чашніцкага р-на.

[3] Зап. Мішына В.І. і Мішын П.І. ў 2007 г. ад Чэклін А.П., 1930 г.н. у в. Макараўшчына, Лепельскага р-на

сюджанне на тэрыторыі Беларусі мела "жартоўнае вяселле" падстаўных маладых, у найбольш разгорнутым выглядзе зафіксаванае ў палескай лакальнай традыцыі. У дадзеным выпадку "падстаўныя маладыя" становяцца галоўнымі ўдзельнікамі вясельнага рытуалу, арганізаванага па законах карнавальнай перавернутасці: "У панядзелак вечарам зыходзяцца ў вясельны двор, сядаюць за сталы, падсілкуюцца і ўжо выдумляюць сваіх жаніха і нявесту. Мужчына пераапранаецца ў нявесту, а жанчына ў жаніха, іх па-свойму распісваюць, віншуюць, але больш словамі даруць падаркі, бывае, што і нецынзурныя словы і пажаданні гавораць. Яшчэ выбіраюць папа, пастуха, цыганаў, ну хто каго прыдумае і як перадзенецца, то тым і будзе" [4, с. 77–78].

Для тэрыторыі Падзвіння ў большай ступені характэрна імітацыя асобных элементаў вяселля з падстаўнымі маладымі і неабходнасць выкупу ў іх месца сапраўднымі маладымі: "…шырока распаўсюджаная гульня – падстаўныя маладыя: як толькі жаніх з нявестай выйдуць з-за стала, іх месцы тут жа займаюць ражаныя – мужчына, адзеты нявестаю, і жанчына ў ролі жаніха. Вярнуўшыся, сапраўдныя маладыя доўга і весела выкупліваюць сваё месца" [5, с. 374]. Варта адзначыць, што пераапрананне ў падстаўных маладых мела шырокае распаўсюджанне ў другой паове ХХ ст., характэрна яно і для сучаснага вяселля як сельскага, так і гарадскога.

Такім чынам, маскіраванне падстаўных маладых адбываецца найперш з дапамогай імітацыі вясельнага касцюма, прычым вельмі часта мае месца травестызацыя процілегла полу, падкрэсліванне полавых прыкмет жаніха і нявесты і г.д.: "Госці рабілі не сапраўднага жаніха і нявесту, у асноўным жаніхом была жанчына, а нявестай мужчына"[4]; "На второй день, когда мы приехали в ресторан, на наших почетных местах сидели переодетые гости – мой брат с подругой – в карикатурных костюмах жениха и невесты, у которой фата была сделана из светлой тюли. Причём они отказывались покинуть свои места и говорили, что именно они и есть молодожёны"[5]. Акцыянальны кампанент маскіравання заключаецца ў імітацыі элементаў абраду: "жаніх" і "нявеста" сядзяць за вясельным сталом, госці іх "віншуюць", крычаць "горка" і г.д.

Папулярнасць пераапранання ў "падстаўных маладых" на сучасным этапе, найперш абумоўлена дамінаваннем забаўляльнай функцыі маскіравання. У традыцыйным жа абрадзе яно магло выконваць і шэраг рытуальных функцый.

Так, з'яўленне "падстаўных маладых" можна разглядаць як апатрапейны прыём. У працэсе канструявання новай сістэмы сацыяльных адносін, калі, адпаведна логіцы традыцыйнага светапогляду, закладваюцца асновы дабрабыту і ладу новастворанай сям'і, магчыма негатыўнае ўздзеянне шкодаsucceeding носных сіл. Таму падстаўныя маладыя выступаюць у якасці сродка нейтралізацыі гэтага негатыўнага ўздзеяння і тым самым забяспечваюць сапраўдным маладым шчаслівае сямейнае жыццё.

Дадзеная рытуальная функцыя "падстаўных маладых" можа быць абумоўлена асаблівасцямі прасторавай арганізацыі вясельнага застолля. Лакалізацыя "падстаўных маладых" – менавіта месца за сталом, якое ўмовамі рытуалу прызначана для маладых сапраўдных, і якое ніхто іншы займаць не меў права. У прасторавай структуры вясельнага застолля яно звязана з комплексам уяўленняў аб пераразмеркаванні долі, надзяленні маладых неабходнымі дабротамі і г.д. У абрадавай практыцы месца маладых надзяляецца высокім семіятычным статусам і пэўным чынам маркіруецца (на яго сцеляць кажух, акрамя таго, яно традыцыйна суаднесена з покуццю). Дарэчы, і ў сучаснасці пры афармленні памяшкання, дзе будзе праходзіць вясельнае застолле, дызайнеры імкнуцца нейкім чынам выдзеліць месца маладых (з дапамогай стужак, драпіровак, паветраных шароў, разнастайнага дэкору).

Такім чынам, месца маладых за сталом як каштоўнасны локус, з'яўляецца аб'ектам, што патрабуе аховы ад магчымага шкоданоснага ўздзеяння, якое, у сваю чаргу, можа перашкодзіць нармальнаму ходу рытуалу, а значыць, і нармальнаму будучаму жыццю маладых. Таму падстаўныя маладыя выступаюць у ролі персанажаў, якія не дазваляюць шкодаперсанажаў носным сілам заняць пустуючае месца маладых ці аказаць на яго (і, адпаведна, на саміх маладых) негатыўнае ўздзеянне. Разам з тым, паколькі падстаўныя маладыя маскіраваныя, яны адводзяць магчымую шкоду ад саміх сябе.

Яшчэ адным магчымым варыянтам трактоўкі прысутнасці маскіраваных на дадзеным этапе вяселля з'яўляецца ўвасабленне ў іх пэўных звышнатуральных істот (продкаў, міфалагічных персанажаў), што сваёй сімвалічнай прысутнасцю санкцыянуюць стварэнне новай сям'і, надзяляюць яе неабходнымі дабротамі. У такім выпадку выкуп, што плоцяць сапраўдныя маладыя падстаўным – гэта, з аднаго боку, плата за выкананую паслугу, а з другога – ахвяра прадстаўнікам іншасвету адпаведна прынцыпу рытуальнага дараабмену.

*Вясельныя "цыганы"* – звычай, што меў даволі шырокае распаўсюджанне па тэрыторыі Беларусі. На Падзвінні, наколькі дазваляюць меркаваць апублікаваныя апісанні і палявыя матэрыялы, ён меў распаўсюджанне пераважна ў цэнтральнай і заходняй лакальных традцыях, сустракаюцца адзінкавыя

[4] Зап. студэнтка ПДУ Падложная Г.М. ў 2007 г. ад Падложнай І.М., 1964 г.н. у г. Наваполацк.
[5] Зап. студэнтка ПДУ Лабоха Г.М. ў 2008 г. ад Шаршун А.Д. ,1965 г.н. у г. Наваполацк.

звесткі аб "цыганах" ва ўсходніх рэгіёнах. Вясельныя "цыганы" – гэта зборная назва, пад якой разумеецца даволі шырокае кола маскіраваных персанажаў (не толькі ўласна "цыганы", але і "доктар", "салдат", "дзед" і "баба" і інш). Часам "цыганамі" называюцца проста пераапранутыя ўдзельнікі вяселля, пры гэтым імітацыя вобліку менавіта цыганоў зусім неабавязковая.

Як адзначае Л. Іўлева, паняцце "цыганы" "само па сабе выражае пэўную сутнасць пераапранання, як бы сінтэзуючы пры гэтым цэлы спектр уласцівых яму ідэй. "Цыганіць" – гэта і выпрошваць міласціну, жабраваць (на акцыянальным узроўні ў пераапрананні тыпу каляднага гэтаму адпавядае абыход двароў, калі група пераапранутых з'яўляецца з мяшком і атрымлівае ад гаспадароў пачастунак). "Хадзіць цыганам" – гэта і блукаць, не мець лакальнай прымацаванасці (пераапранутыя часта выдаюць сябе за вандроўнікаў, якія знаходзяцца ў дарозе і ідуць здалёк). "Цыганіць" – гэта і зарабляць крадзяжом…, і – акрамя таго – валодаць тайнымі ведамі (у пераапрананні цыганка не дарма дэманструе сваё майстэрства варажбіткі – варожыць на картах ці па руцэ). Такім чынам, менавіта ва ўяўленнях аб "цыгане" спецыфічна скрыжаваліся многія ключавыя ідэі пераапранання" [6, с. 64]. Верагодна, указаныя адметнасці маскі-персанажа "цыгана" абумовілі не толькі яе шырокую распаўсюджанасць у традыцыйнай культуры ("цыган" фігуруе ў калядных абыходах, масленічнай, мікольскай абраднасці і інш. [7]), але і ўказаную вышэй намінацыю пераапранутых "цыганамі" безадносна выконваемых імі роляў.

Вясельныя "цыганы" карыстаюцца наборам згаданых вышэй спосабаў і сродкаў маскіравання: "бывала, перадзенуцца, там жэншчына ў мужчыну перадзенецца, ці мужчына там у жэнскую адзежу"[6]; "Ну вот прытвараюцца, вытвараюцца, "ці ўзнаеш ты мяне?"… Абы-якую адзежу знайдуць якую-небудзь, рваную такую… Намажуцца і малёўкамі, і сажай, і чым ні папала. …. Дзе дзеўка маладая, а яны гэткія змазаныя, возьміць гэту дзеўку, да сябе прыблізіць, каб яе змазаць"[7]; "…весялілі, цыганкі гадалі, варажылі маладым, хто ў свадзьбі. Вот, гаворуць, надзенуцца ўжо і цыганямі, і ўкруг ходзюць маладых, гэта ўжо варажыць... варожуць цыганкі. Гэта было…. Вот адзенуць длінныя плацці, там і цыган, і цыганка..., мужчына і жэншчына, і патом умажуцца сажай, і патом гадаць, гадаць, каля столу ходзюць, і патом штоб умазаць, гонюцца цалавацца, а гэтыя баронюцца: "Ай, наце вам і грошы, ўсё, толька ні нада, каб нас цалавалі""[8].

У асобных апісаннях сустракаецца даволі ўтылітарнае, на першы погляд, тлумачэнне звычаю вясельных цыганоў: "Напіўшыся, госці ідуць па вёсцы "па цыганям", збіраюць яйкі, крупы, авёс, ячмень – хто што дасць. І прыносяць усё гэта сватам. Сваты з сабраных яек робяць яечню і частуюць гасцей" [2, с. 430]; "Госці, якія разгуляліся, балююць у маладых і ў доме маладой да самай пятніцы. На што баляваць? Гаспадары – патраціліся, прывезеныя запасы – скончыліся, грошай таксама няма: ўсе ў карчму пайшлі. Прыезджыя госці ходзяць пераапранутымі ў цыган па вёсцы… Іх прымаюць і даюць ім сыру, масла, кілбас, яек, а на гарэлку наладжваюць складчыну ("складанка")" [8, с. 130]. На думку К.А. Цвіркі, "гэты вясёлы звычай, які дазваляў "жабраваць", "красці" ў сваякоў, як бы гаварыў, што набыткі кожнай сям'і былі і набыткамі ўсяго роду. Звычай гэты яшчэ больш збліжаў усіх сваякоў і быў адным з праяўленняў распаўсюджанай здаўна ўзаемавыручкі, узаемадапамогі" [9, с. 28]. Пераважна на сацыяльную функцыю вясельных пераапрананняў указвае і І.С. Чарнякевіч: "з'яўленне пераапранутых менавіта на заключных этапах вяселля дазваляе меркаваць аб працістаўленні ўдзельнікаў гэтых пераапрананняў астатнім гасцям, што збліжае сем'і жаніха і нявесты ў новай якасці [10, с. 353]. В.А. Гура звяртае ўвагу на культурна-нарматыўны сэнс абрадавага пераапранання, адзначаючы, што "штукарскія і бясчынныя паводзіны пераапранутых напрыканцы вяселля звязаныя з часовым зняццем забаронаў, выкліканым распадам структуры сацыяльна-родасных адносін у лімінальнай фазе абраду… Такі тып паводзін кантрастуе з агульнапрынятымі нормамі і адначасова сцвярджае вяртанне да нормы, папярэджваючы сабой уступленне ў сілу абноўленых структурных сувязей у соцыуме…" [11, с. 212–213].

Разам з тым, прысутнасць падобнай групы маскіраваных персанажаў у вясельным абрадзе звязана з выкананнем імі шэрагу магічна-рытуальных функцый. Карнавальны характар маскіравання (вывернутасць ці старасць адзення, незвычайны знешні выгляд, антыпаводзіны) дазваляе звязаць названых персанажаў з антысветам. У сувязі з гэтым найбольш рэльефнай выглядае іх апатрапейная функцыя, якая дастаткова падрабязна разгледжана ў літаратуры[9]. Апатрапейны эфект дасягаецца не толькі за кошт гукавых і візуальных "прыёмаў адпалохвання" нячыстай сілы, аднак і таму, што пераапранутыя як бы "выпадаюць" са сферы чалавечага і такім чынам набываюць здольнасць кантраляваць сферу нечалавечага, заўважыць прысутнасць шкоданосных і небяспечных істот і прадухіліць іх негатыўнае ўздзеянне.

[6] Зап. Мішына В.І. і Мішын П.І. ў 2007 г. ад Чэклін А.П., 1930 г.н. у в. Макараўшчына Лепельскага р-на.
[7] Зап. Мішына В.І. і Мішын П.І. ў 2008 г. ад Рыбакоз В.І., 1925 г.н. у в. Нікіцёнкі Шаркаўшчынскага р-на.
[8] Зап. Мішына В.І. і Мішын П.І. ў 2009 г. ад Парцянка Г.А., 1928 г.н. у в. Несцераўшчына Докшыцкага р-на.
[9] Агляд даследаванняў, у той ці іншай ступені прысвечаных праблемам семантыкі абрадавых пераапрананняў, ажыццёўлены ў працы Л.М. Іўлевай "Пераапрананне ў рускай традыцыйнай культуры" (СПб, 1994), с. 17-23.

Прыведзенае вышэй апісанне абыходаў вясельнымі “цыганамі” двароў і збор імі прадуктаў выклікае асацыяцыі з каляндарнымі абыходамі (калядными і валачобнымі), што таксама ўказвае на суаднесенасць маскіраваных персанажаў з іншасветам. У такім выпадку, па аналогіі з валачобнікамі і калядоўшчыкамі, маскіраваныя ўдзельнікі вяселля могуць выконваюць яшчэ і так бы мовіць, “рэтраслятыўную” фунцыю, надзяляючы дабротамі не толькі непасрэдна маладых, але і іншых прадстаўнікоў вясковай супольнаці, за што і атрымліваюць падарункі ад гаспадароў двароў па прынцыпах рытуальнага дараабмену Аднак у адрозненне ад калядных і валачобных абыходаў этнаграфічныя апісанні не фіксуюць разгорнутага і ўстойлівага “сцэнарыю” паводзін вясельных цыганоў, у які быў бы ўключаны рытуальна значны вербальны ці акцыянальны складнік (кшталту валачобных песень ці “памірання” Казы). Пытанне аб суаднесенасці вясельных і каляндарных абыходаў патрабуе далейшага вывучэння.

Па меры разбурэння традыцыйнай культуры адбывалася аслабленне магічных і сімвалічных функцый вясельнага абраду і яго асобных кампанентаў. Забаўляльна-гульнёвая функцыя, наадварот, зведала ўзмацненне. Яна асабліва актуалізавалася ў вясельным маскіраванні ў апошні час. Пад уплывам масавай культуры, тэлебачання і Інтэрнэту асартымент пераапранутых персанажаў пашыраецца за кошт увасаблення эстрадных зорак, герояў папулярных тэлесерыялаў і г.д. Пераапрананні з забаўляльнай мэтай часта выкарыстоўваюць і арганізатары сучасных вяселляў, у іх для гэтага маюцца спецыяльна падрыхтаваныя касцюмы, маскі і сродкі грыміравання. Пры гэтым сучасныя гульнявыя пераапрананні таксама будуюцца на прынцыпах травестызацыі, антыпаводзін і г.д.: “Гостей могут переодевать в разные конкурсы… Переодевали и в полковника, переодевали в разных героев, и в Онегина и в Ольгу. Кстати и переодевали не так, что девушка – это значит Ольга будет, а могли парня переодеть в женщину. Но это уже зависит от того, как организует тамада»[10].

*“Іграць марш музыкантам”*.У межах разглядаемай тэмы хацелася б звярнуць увагу яшчэ на адзін звычай абрадавых пераапрананняў (маскіравання), зафіксаваны ў паўночна-заходніх раёнах Падзвіння. У лакальнай традыцыі Міёрскага, Шаркаўшчынскага і Глыбоцкага раёнаў ён меў назву “іграць марш музыкантам”. Гэтае абрадавае дзейства звязана з даволі шырока распаўсюджанай у заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі традыцыяй “вясельнага маршу”, пад якой разумеецца не столькі выкананне маршавых мелодый вясельнымі музыкамі, колькі своеасаблівая працэдура ўшанавання імі кожнага з вясельных гасцей.

“Марш” ігралі напрыканцы вясельнага застолля ў маладой (перад ад’ездам яе да жаніха), а таксама напрыканцы вяселля ў жаніха. Музыкі ігралі “марш” кожнай пары гасцей, за што тыя павінны былі плаціць грошы. Грошы гэтыя выступалі ў якасці платы ўласна музыкам (радзей – аддаваліся маладым): “Пад канец ужо... ну вот дапусцім за сталом сідзяць... маршы ігралі. Баяністы гэны.... музыкі. Ну дык вот яны дагавараваюцца з маладым ілі с хазяінам, еслі яны не збяруць, ну, напрымер, сто рублей, то тады даплачывалі. Каждаму... Вот па парах там хто, маладзёж сядзіць, взрослыя, і яны там свае ўсякія гэты прыбавуткі, ну і вот гэты ім ложуць у тарэлку”[11]; “Марш іграў. Бальшынство – марш. Каждый – пара, хто сядзіць, муж з жаной там ілі парынь з дзевушкай, ён для іх іграіць марш. Ну і плацяць. Скока есць у яго там дзенег”[12]; “еслі сабралі марш... з марша грошы сабралі настолька, сколька дагаварыліся, значыць, хваціць. Еслі мала – значыць даплачываюць”[13]; “гармaністы ходзяць ужо вакруг і паздраўляюць сразу маладых, а патом – усіх гасцей, паадзіночку ілі парамі. Тады ўжо ім дзеньгі ложаць, гэта гарманістам ужо збор, а тады ўжо гарманісты песні якія спяваюць” [12, с. 81].

Менавіта да гэтага моманту вяселля ў названых вышэй раёнах Падзвіння і быў прымеркаваны звычай “іграць марш музыкантам”. Пасля завяршэння “маршу” ўдзельнікі вяселля пераапраналіся і такім жа спосабам, як музыканты ўшаноўвалі гасцей, “ігралі марш” самім музыкантам, толькі ўжо па законах каравальнай перавернутасці: “як ужо музыкантам марш, там сабіралі ўсё, што зналі. І скавароды, і каструлі грязныя, лапату хлебную, і такая, дзе валік быў з палкай… Сколька можна стараліся выбіць з іх...”[14]. Пры гэтым важным было не столькі пераапрананне, сколькі менавіта наяўнасць такіх спецыфічных “музычных інструментаў”. Адпаведна, пасля выканання “маршу” музыкі таксама павінны былі заплаціць выканаўцам.

Верагодна, звычай гэты даволі позні, як і сам звычай “іграць марш” вясельным гасцям. Разам з тым, у ім таксама фігуруюць архаічныя элементы карнавальнай перавернутасці: “музычныя інструменты” і “му́зыка”, якія насамрэч такімі не з’яўляюцца, дзеянні, адваротныя дзеянням музыкаў і г.д. З улікам згаданага вышэй працэсу трансфармацыі функцый традыцыйнай абраднасці, апісаны лакальны звычай падзвінскага вяселля, які знешне выглядае менавіта як гульнёвы, можа ўтрымліваць у сабе кампа-

[10] Зап. студэнтка ПДУ Пяткун І. ў 2010 г. ад Мурзіч В.І., 1989 г.н. у г. Глыбокае.
[11] Зап. Мішына В.І. і Мішын П.І. ў 2008 г. ад Лагуна І.К., 1928 г.н. у в. Нікіцёнкі Шаркаўшчынскага р-на.
[12] Зап. Мішына В.І., Мішын П.І. ў 2008 г. ад Буды Ф.В., 1934 г.н. у в. Нікіцёнкі Шаркаўшчынскага р-на.
[13] Зап. Мішына В.І. ў 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. н. у в. Волкаўшчына Міёрскага р-на.
[14] Зап. Мішына В.І. ў 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. н. у в. Волкаўшчына Міёрскага р-на.

ненты, што перайшлі ў яго са старажытных абрадавых формаў. Аднак даследаванне гэтага пытання патрабуе, у сваю чаргу, больш глыбокага вывучэння абрадавых функцый музыкаў як у кантэксце традыцыйнага вяселля, так і ў традыцыйнай культуры ў цэлым.

**Заключэнне.** Маскіраваныя персанажы выконваюць у вясельным абрадзе шэраг магічных, сацыяльных і забаўляльна-гульнёвых функцый (апошнія асабліва характэрны для сучаснага стану бытавання вясельнай абраднасці). Маскіраванне адбываецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі карнавальнай перавернутасці з дапамогай даволі шырокага асартыменту разнастайных сродкаў і спосабаў.

ЛІТАРАТУРА:


1. Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т.І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.
2. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – 1886–1912. – Вып. 8 : Быт белорусса. – Вильна, 1912 – 600 с.
3. Мішына, В.І. Структурна-функцыянальныя аспекты слупавога рытуалу ў традыцыйным вясельным абрадзе беларусаў / В.І. Мішына // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XVI (63) Региональной науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, 16–17 марта 2011 г. – Витебск : ВГУ им П.М. Машерова, 2011. – Т. 1. – С. 437–439.
4. Новак, В.С. Абрадавы фальклор Гомельскага Палесся / В.С. Новак. – Гомель : Гомельскі цэнтр навуковатэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1998. – 139 с.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / рэдкал. Т.Б. Варфаламеева [і інш]. – Мінск : Бел. навука, Выш. школа, 2001–2013. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – 2004. – 910 с.
6. Ивлева, Л. Ряженье в русской традиционной культуре / Л. Ивлева. – СПб. : [Б. и.], 1994. – 235 с.
7. Сухадолаў, А. Значэнне маскі цыгана ў абраднасці беларусаў [Электронны рэсурс] / А. Сухадолаў // Міфалогія-фальклор-літаратура: праблемы паэтыкі : зб. навук.прац / склад. Т.І. Шамякіна ; пад агул. рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2007. – Вып. 5 – С. 125–129. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/handle/123456789/26694. – Дата доступу: 10.04. 2016.
8. Свадьба у белорусов Видзской волости (в записи народного учителя Видзской школы Михаила Фёдоровича Посоха) // Видзы и Видзовщина: очерки и документы. – Вильнюс : Древлеправославие. Слово и книга. – 2000. – С. 113–131.
9. Вяселле: Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі ; муз. дадатак З.Я. Мажэйка ; рэд. тома В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 683 с.
10. Чарнякевіч, І.С. Абрадавыя пераапрананні ў структуры палескага вясельнага рытуалу / І.С. Чарнякевіч // Культура, наука, образование в современном мире : материалы IV междунар. науч. конф. ; редколл. Л.Л. Малышкова [и др.] – Гродно : ГГАУ, 2009. – С. 352-356
11. Гура, А.В. Брак и свадьба в славянской народной культуре: семантика и символика / А.В. Гура. – М. : Индрик, 2012. – 935 с.
12. Глыбоччыны духоўнасці глыбіні: Народная духоўная культура Глыбоцкага раёна / аўт. кал.: В.С. Новак [і інш]; пад. агул. рэд. В.С. Новак. – Мінск : Белта, 2014. – 304 с.


## RITUAL FUNCTIONS MASCED CHARACTERS IN TRADITIONAL WEDDING BELARUSIANS OF DVINA REGION (OF THE END OF 19TH – BEGINNING 21ST CENTURIES)

***V. MISHYNA, P. MISHYN***

*This article examine ritual functions masced characters (such as “gypsy”, “fake couple”, etc.) at the context traditional wedding Belarusians of Dvina region on the basis of published ethnological descriptions and field records. Among the main functions of the designated characters are defined as follows: entertainment (most characteristic of modern rituals), protective and the function of blessings and giving shares. It describes basic methods and means used to disguise, show the process of it’s transformation under the influence of socio-cultural changes during this period.*

polotsku